# З новым годам, таварышы!


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983

29

СНЕЖНЯ

ЧАЦВЕР

№ 37 (1413)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.


"Беларускі універсітэт"

мэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

## У РАБОЦЕ III ЗЛЁТУ

рабочых і сельскіх карэспандэнтаў Мінскай вобласці, які прайшоў у Мінску 24 снежня, прынялі ўдзел студэнты універсітэта — грамадскія карэспандэнты рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт».

**Л. МАРЦЫЁНКА.**

## ЭКСПАЗІЦЫЯ ВЫСТАЎКІ

беларускай графікі адкрыта на факультэце радыёфізікі і электронікі. Наведвальнікі змогуць пазнаёміцца з творамі (а іх тут выстаўлена больш за сто) беларускіх майстроў пэндзля.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

## СПРАВАЗДАЧНЫ КАНЦЭРТ

даў хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Удзельнікі паказалі гледачам цікавую праграму, у якой прагучалі беларускія, рускія і украінскія народныя песні.

**Р. МІХАЙЛАВА,**
**удзельніца хору.**

## ДЗЕНЬ ПРАКТЫКІ

прайшоў на факультэце журналістыкі. На сумесным пасяджэнні будучых работнікаў прэсы, выкладчыкаў факультэта і прадстаўнікоў раённых газет, радыё і тэлебачання абмяркоўваліся вынікі студэнцкай практыкі. Восем лепшых матэрыялаў адабраны на конкурс «Залатое пяро».

**Ч. ВІКТАРАЎ.**

## НА ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола універсітэта разгледжана пытанне «Аб зацвярджэнні вынікаў гадавой зверкі». Бюро адзначыла дрэнную арганізацыю зверкі на факультэтах: журналістыкі, фізічным, біялагічным. За несвоечасовую ліквідацыю недахопаў, выяўленых у ходзе гадавой зверкі, сакратару камітэта камсамола факультэта журналістыкі Л. Чарапавіцкаму аб'яўлена строгая вымова.

**В. ЮР'ЕЎ.**

● СТУДЭНТ І НАВУКА ●

# ГАРТУЮЧЫ ЗБРОЮ ДУМКІ

АКТЫВІЗАВАЦЬ навукова-даследчую работу студэнтаў, паглыбіць і узбагаціць іх веды ў галіне сучасных праблем навукі, метадалогіі навуковага пазнання, крытычнага аналізу сучаснай буржуазнай філасофіі— такая галоўная мэта Х Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху. З 21 па 23 снежня ва універсітэце праходзіў першы тур гэтага конкурсу. У ходзе яго працавала дзесяць секцый, на якіх студэнты выступалі са сваімі дакладамі. Як адзначыў аргкамітэт, выступленні ўсіх удзельнікаў вызначала глыбокае валоданне марксісцка-ленінскай філасофіяй, самастойнасць у падрыхтоўцы навуковых дакладаў. Найбольшую цікавасць у слухачоў секцыі марксісцка-ленінскай філасофіі (гуманітарныя факультэты) выклікалі даклады Д. Карэнкі, Г. Квасіновіч, Л. Каленкі — студэнтаў філасофскага аддзялення. Добрыя ўражанні засталіся і пасля выступленняў студэнтаў-журналістаў Т. Бяльковіч, І. Сушкевіч, А. Зянкевіч, А. Матусевіч. Пытанні філасофіі хвалююць і замежных студэнтаў. Аб гэтым сведчаць даклады, падрыхтаваныя Хасэ Матасам (Куба), А. Мышланавай (ЧССР), Аге Седу Мухамедам (Бенін).

— Такія сустрэчы вельмі карысныя, — гавораць студэнты, удзельнікі конкурсу. — Яны дазваляюць праверыць свае веды, а таксама даведвацца шмат новага з дакладаў сваіх таварышаў.

Вялікая заслуга ў падрыхтоўцы дакладаў і арганізацыі канферэнцыі належыць выкладчыкам кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў прафесару В. С. Сцёпіну, дацэнтам Я. В. Петушковай, А. А. Міхайлаву, кандыдату філасофскіх навук Л. Ф. Кузняцовай, выкладчыкам А. В. Баркоўскай, Л. П. Мухарскай.

Лепшыя даклады рэкамендаваны для ўдзелу ў II туры.

**А. ЯСКЕВІЧ,**
**адказны за навукова-даследчую работу на кафедры марксісцка - ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.**

● СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ ●



ЗДЫМАК НА ПАМЯЦЬ. Аляксандр Васільевіч Кірсанаў і яго госці ў дзень яго 85-годдзя. Маленькая частка гасцей. Чамусьці захацелася выбраць іменна гэты здымак — былы аднапалчанін Герман Сцяпанавіч Губарэвіч і студэнты універсітэта Барыс Грыцюк і Ала Ермачок. Гісторыя і сучаснасць. Той, з кім поплеч ваяваў Аляксандр Васільевіч, і тыя, хто абавязаны шчасцем старэйшаму пакаленню, а значыць, і Кірсанаву. Бо не шкадаваў ён ні сіл, ні жыцця, змагаючыся за свабоду Радзімы. Змагаючыся ў галодныя гады грамадзянскай, у страшэнныя — Айчыннай. Змагаўся, не шкадуючы сябе. Бо такім ён быў, такім заўсёды будзе — прамым, рашучым, пераканаым у правільнасці свайго жыцця. Аб гэтым гаварылі сябры, аб гэтым гаварыў старшыня савета ветэранаў універсітэта дацэнт Іван Васільевіч Марчанка, уручаючы Аляксандру Васільевічу Ганаровую грамату Мінскай секцыі Савецкага камітэта ветэранаў вайны. Успаміны, успаміны... Колькі іх было ў гэты дзень! І не ўтрымалася жонка Аляксандра Васільевіча Алена Пятроўна, заплакала, калі ветэраны разам з камсамольцамі заспявалі такую блізкую, такую родную для старэйшага пакалення песню «Эх, дороги, пыль да туман...». І Аляксандр Васільевіч заспяваў не моцным, не гучным, але рашучым, упэўненым голасам.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ.** Фота аўтара.

● НАШ КОНКУРС ●

# ЛЕПШЫЯ ПУБЛІКАЦЫІ

РЭДАКЦЫЯ падвяла вынікі конкурсу на лепшую публікацыю ў лістападзе — снежні 1983 года. Найбольш актуальнымі, змястоўнымі і цікавымі прызнаны праблемны рэпартаж **С. Плыткевіча** «Зорныя паходы павінны быць зорнымі» (№ 32), інтэрв'ю дацэнта кафедры геаметрыі **С. Конанава** «Матэматыка — гэта мастацтва знаходжання гармоніі...» (№ 34), карэспандэнцыя кіраўніка прэс-цэнтра камітэта камсамола **Ю. Варатніцкага** «Размова аб размове з чытачом» (№ 31).

Віншуем лаўрэатаў конкурсу!

● СПРАВА ЎСІХ І КОЖНАГА ●

# МЫ—ЗА МІР!

САВЕЦКІ НАРОД, усё прагрэсіўнае чалавецтва з вялікім уздымам і натхненнем успрынялі Заяву Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ю. У. Андропава. Гэта яшчэ адно пацвярджэнне міралюбівай палітыкі Савецкага Саюза, імкнення зняць міжнародную напружанасць, узмацніць барацьбу за мір.

Актыўнымі барацьбітамі за інтарэсы ўсіх міралюбівых краін і народаў павінны стаць і студэнты. На камсамольскім сходзе, які прайшоў нядаўна ў нашай групе, было вырашана паслаць пісьмо з подпісамі прэзідэнту ЗША, канцлеру ФРГ і прэзідэнту Італіі, выказаўшы тым самым пратэст супраць курсу ЗША на размяшчэнне ў Заходняй Еўропе ядзернай зброі і палітыкі ўрадаў, якія дазволілі размяшчэнне яе на сваіх тэрыторыях.

Мы выражаем упэўненасць, што нашу ініцыятыву падтрымаюць іншыя групы. Гэта будзе яшчэ адным крокам у справе барацьбы за мір.

Наша імкненне — прадухіліць узнікненне ядзернай вайны. Мы не хочам паўтарэння жахаў другой сусветнай вайны.

**Калектыўны карэспандэнт— 1-я група II курса хімфака.**

## ● ЗАХАПЛЕННІ ●



— А ЦЯПЕР ВЫ ўбачыце «Іспанскі танец»!

Музыка грымнула неяк раптоўна, адразу пасля слоў вядучага, дробным пошчакам пранеслася над радамі гледачоў, завірухай узнялася пад самыя люстры, і... на сцэне паявілася яна — прыгожая дзяўчына ў казачна белай сукенцы. Танец, танец, танец! То неверагодна хуткае выстукванне абцасікамі, то надзіва эфектны паварот, то плаўныя выразныя пераходы. Здавалася, лепшая танцорка з Барселоны прыехала ва універсітэт, каб паказаць студэнтам сваё майстэрства, прадэманстраваць ім іспанскі тэмперамент, задор, весялосць.

...Апладысменты рванулІся з залы густой сцяной, як толькі дзяўчына закончыла апошняе па. Выканаўца — Вікторыя Каўхута, студэнтка філалагічнага факультэта, ленінскі стыпендыят — шчасліва глянула на прысутных і пакланілася — яна таксама была задаволена танцам.

Фота **С. Плыткевіча.**

## ● АМАЛЬ АСАБІСТАЕ ●

У МАРОЗНАЕ паветра ўварваўся такі магутны голас будзільніка, што здавалася, ён падыме на ногі ўвесь інтэрнат. Хвіліны дзве ён заліваўся на ўсе лады, яго голас браў то вышэйшыя, то пераходзіў на зусім нізкія ноты. Галасістасць званка зліваласяся са скрыпам ложкаў, шморганнем насоў, нейкім незадаволеным мармытаннем. Раптам са спальнага мяшка паказалася галава, потым імкліва вышмыгнула рука і з такой сілай урэзала па будзільніку, што той два разы буркнуў і заглох, нібыта адбілі ў яго ўсё нутро.

— Колькі там ужо? — высунулася з-пад

# З НОВАГА — ПА-НОВАМУ

коўдры ў другім кутку пакоя нечая галава, і ў звонкім паветры раздаліся хрыплыя галасы:

— Не ведаю. Увечары на сем ставілі.

— Тады ўжо ўставаць трэба.

— Ну-ну, паспрабуй...

Адчувалася, што гэтыя словы былі сказаны так, што зуб пачынаў стукаць аб зуб, і таму галава не замарудзіла, каб знікнуць у спальніку.

На нейкі час у пакоі ўсталявалася цішыня. Але ніхто не спаў і спаць не мог, бо ўсе былі заняты цяжкай думай: як вылезці з цёплага спальніка на мароз. Яшчэ з тых далёкіх часоў засялення ў інтэрнат іх не пакідае гэтая дума. Праўда, тады быў верасень і надвор'е не такое ўжо халоднае, ды і дзяўчаты былі больш аптымістычна настроены: уставім шкло ў аконнай раме. А зараз? Зараз яны паступова прывыкаюць да капрызаў зімы. Бывае, злітуецца яна: на двары пацяплее, тады тэрмометр у пакоі падымецца вышэй нуля. А бывае... Вось як сёння. Маразішча страшэнны. Шыбы інеем пакрыліся. Вада на стале ў стакане замерзла. Адно выратаванне: спальнікі ды коўдры цёплыя.

— Не, — гэта было сказана так рашуча, быццам чалавек згубіў апошнюю надзею.—Ты, Валя, колькі разоў да каменданта хадзіла?

— Чатыры, збіраюся пяты ісці.

— А ён што?

— Да сталяра накіроўвае.

Дзядзя Вася тут такі ходзіць, можа бачылі? Хітрэц — страшэнны. Кажа: няма ў мяне шкла. А якое і ёсць, дык на калідоры ўставіць трэба, на кухні, у чытальным пакоі. Звычайная гісторыя. Ён усім так адказвае і намёкі робіць, што зацікавіць трэба. У дзяўчат у суседнім пакоі замок у дзверы ўстаўляў, дык тыя пакуль зялёную паперку не «падаравалі», месяц на заняткі па чарзе не хадзілі: маёмасць пільнавалі, ды і дзядзю Васю ўсё чакалі. Відаць, і нам такога кірунку трымацца трэба. Зробім прыемнае дзядзю Васю пад Новы год, можа і ён да нас уважлівей аднясецца. І тады застануцца старыя парадкі ў старым годзе. А зажывём мы у новым годзе па-новаму. Ад гэтай думкі ўсім так прыемна і цёпла, што дзяўчаты хутка паўскоквалі з ложкаў і адразу ж да кашалёчкаў. Трэба ж зрабіць прыемнае дзядзю Васю. Ну а потым і на заняткі можна.

**А. ХІТРАЯ.**

## ● НУ І НУ! ●

# ЗУСІМ НЕ ЦУДОЎНЫ «ЦУД»

ЗАЎВАЖАНА: існуюць цуды іменна пераднавагодняга характару. Іх узнікненне нікім не плануецца, нікому не падуладна. Нарэшце, цуды гэтыя, нават значна пазней, не так ужо лёгка растлумачыць. Звычайна яны ўяўляюць сабой цікавую блытаніну, неспадзяваныя спатканні, неверагодныя прыгоды. Словам, тое, што потым прыемна ўспомніць за вясёлым навагоднім сталом.

Але існуюць пераднавагоднія дзівосы зусім іншага паходжання. І не тое, каб яны былі ў чымсьці надзвычайнымі. Не. У нашым выпадку хутчэй наадварот — «дзіва» гэтае паўтараецца з году ў год і парадкам ужо надакучыла. Калі казаць больш дакладна, то носіць яно стыхійны характар. І на манер сапраўдных стыхій раптоўна абрушваецца, як (прабачце, ледзь не сказаў «снег») дождж на галаву. Так, так. Як дождж. Аб тым, што аўтар гэтых радкоў мае рацыю, можа сведчыць здымак, які быў зроблены ў 56-й аўдыторыі геаграфічнага корпуса ў час лекцыі па эканамічнай геаграфіі замежных краін.

Незапланавана ў той дзень дзейнічала толькі надвор'е. Тэмпература паднялася на некалькі градусаў вышэй нуля, і пачаў раставаць снег на даху будынка. Усё астатняе ўжо — верце не верце — цуд. Бо ў 56-й ліло так, нібыта на вуліцы ішоў летні грыбны дождж, а столі раптам не стала.

Вось так, у лужыне вады перад дошкай, бароняючыся пад парасонам ад «непагоды», чытала лекцыю выкладчыца, а студэнты пад звонкі капёж хавалі пад сябе сшыткі і спрабавалі нешта там занатаваць. Ой, і будзе ж ім што з гэтых лекцый успомніць і за навагоднім сталом, і на экзаменах ды заліках у сесію!

Але гэты цуд — не галоўны цуд. Галоўны, у сваю чаргу, складаецца з трох неверагодных недарэчнасцей. Першая: з-за таго, што ў асобных месцах дах вучэбнага корпуса папсаваўся, на вачах разбураецца яшчэ не стары будынак. Другая: на першым паверсе



гэтага ж будынка ва ўтульным закутку размясціўся эксплуатацыйна-тэхнічны аддзел — служба, якой і да сённяшняга дня быццам не пад сілу зрабіць належны рамонт у памяшканні. І апошняе: адкуль узяўся дазвол на тое, каб такія дзівосы, растлумачыць якія даволі проста, існавалі, дзе ўзяўся дазвол на бесклапотнасць, бездапаможнасць і марнатраўства?

А ці не заслаць нам у АГЧ універсітэта Дзеда Мароза з такім пытаннем? Пад самы Новы год ён ужо аднойчы дапамог нам, замарозіўшы цечу. Магчыма, яму як-небудзь удасца дамовіцца і з гаспадарнікамі?

**В. ЧАРНЯЎСКІ,**
**наш кар.**

**НА ЗДЫМКУ:** звычайная лекцыя ў 56-й аўдыторыі геаграфічнага корпуса...

Фота **С. Плыткевіча.**

## ● СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС ●

**МІКАЭЛ ТАРЫВЕРДЗІЕЎ:**

# «АДДАЮ ПЕРАВАГУ РАЗМОВЕ НА РОЎНЫХ»

...ЗАЛА АПЛАДЗІРУЕ стоячы. Мікаэл Тарывердзіеў з усмешкай разводзіць рукамі, маўляў, што з вамі зробіш, і зноў садзіцца за раяль. Ажываюць санеты Шэкспіра, нямоцны, «кампазітарскі», голас — не песня нават — размова — апавядае аб вечнай казцы кахання: «Люблю, люблю, но реже говорю об этом...»

Актавая зала БДУ не ўмяшчае ўсіх жадаючых. Расчынены дзверы, студэнты стаяць у праходах, і, здаецца, не будзе канца канцэрту, таму што зноў і зноў нясуцца з месц заказы-просьбы: «Не исчезай!», «Штонебудзь са святлоўскага цыкла!..»

**— Мікаэл Лявонавіч, ці не здаецца Вам, што мы, студэнты 80-х, менш эмацыянальныя, чым папярэднія студэнцкія пакаленні?**

— Пасля гэтага? (Жэст у бок залы, дзе толькі што адбушавалі авацыі). Неяк, шчыра кажучы, не здаецца.

Хвалююся, што не змагу спакойна пагаварыць: кожную хвілінку ў Тарывердзіева просяць аўтограф, выказваюць словы падзякі, задаюць пытанні. Але хваляванні знікаюць, калі бачу, што ён можа весці гутарку ў самых неспрыяльных умовах. Задаю чарговае пытанне:

**— Лічыцца, што кампазітар, як і мастак, усё гаворыць сваёй творчасцю. Вас цікавяць непасрэдныя кантакты з аўдыторыяй. Чым гэта тлумачыцца?**

— Акрамя іншых, мастацтву уласціва яшчэ і асветніцкая функцыя. Хочацца, каб цябе не проста слухалі, але і разумелі, і задавалі пытанні, самі разбіраліся і нам дапамагалі адчуваць, што добра, а што дрэнна.

**— А Вы не баіцеся, што такая «асветніцкая дзейнасць» можа ператварыцца ў маралізацыю ці —што яшчэ горш! — у дыктат: тое—добра, а вось гэта — не!**

— У тым і складанасць, што як бы ні навязваў свае ўяўленні аб добрым, яны ўсё роўна ў кожнага свае. Я не збіраюся нічога навязваць. Я прапаную — вам выбіраць. А вось што выбераце, залежыць ад густу, які не ў кожнага выхаваны. Бачыце, як няпроста — права выбару ёсць, а ўмення часам не хапае.

**— І што рабіць!**

— Густ выхоўваецца...

**— Як!**

— Спытайце што-небудзь лягчэйшае. Увесь час спрабую адшукаць нейкую агульную «формулу выхавання». Але агульнай, здаецца, не выведзеш. Кожны крочыць па-свойму. На мой погляд, усё пачынаецца з самалюбства.

**— !!**

— Так-так. Яно дае першы штуршок, прымушае спытаць сябе: «Чаму я, як усе, пакланяюся гэтаму ансамблю, выканаўцу? Што ў гэтым ад мяне, што ад моды?»

**— У сваіх творах Вы арыентуецеся ў асноўным на моладзь?**

— Я арыентуюся на людзей, якім блізкія мае творчыя пошукі, мая манера, а маладыя гэта ці старыя... Радуюся, калі нешта зацікавіла і тых, і другіх.

**— Апошні час Вы многа працуеце з маладымі выканаўцамі. Як складваюцца Вашы ўзаемаадносіны? Ці не прыгнятаеце Вы іх сваім аўтарытэтам?**

— Пакуль што ніхто не скардзіўся. Працую з моладдзю з асаблівай адказнасцю, бо іменна ёй, і выканаўцам, і слухачам, вызначаць твар эстрады будучага.

**— А якімі педагагічнымі «сакрэтамі» карыстаецеся?**

— Аддаю перавагу размове на роўных.

...Зала апладзіравала стоячы. Напэўна ў такія імгненні кампазітар дзякуе лёсу за тое, што ён падараваў яму шчасце быць творцам. Гэта потым, за раялем, калі адзін-на-адзін з аркушам нотнай паперы, узнікнуць няўдачы і сумненні, незадаволенасць сабой і тыя «пакуты творчасці», без якіх яна, гэта творчасць, і немагчыма. Але гэта будзе потым. А пакуль — кветкі і апладысменты.

**Запісала Н. КАЛІШЭВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**



*Жадаю маім слаўным маладым таварышам — студэнтам, чытачам «Беларускага ўніверсітэта», на ўвесь 1984 год і на кожны яго дзень поспехаў, бадзёрасці, шчасця.*

*Генадзь Бураўкін*

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ журналістыкі стала традыцыяй запрашаць да сябе ў госці паэтаў, мастакоў, грамадскіх дзеячаў, цікавых людзей. У адзін з пераднавагодніх дзён у самую вялікую журфакаўскую аўдыторыю нельга было праціснуцца: перад студэнтамі выступаў старшыня Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню Генадзь Мікалаевіч Бураўкін. Ён расказаў будучым журналістам пра спецыфіку работы на тэлебачанні, аб праблемах, якія існуюць «па другі бок блакітнага экрана» — у тэлерэдакцыях і на здымачных пляцоўках. Заглядваючы ў будучыню, Генадзь Мікалаевіч павeдаміў аб некаторых найбольш цікавых перадачах, якія прапануе Беларускае тэлебачанне сваім гледачам, і запрасіў студэнтаў у тэлевізійны эксперыментальны клуб моладзі, які мяркуецца адкрыць на тэлебачанні ў 1984 годзе. На развітанне Генадзь Бураўкін прачытаў некаторыя свае вершы, якія ўвайшлі ў паэтычны зборнік «Пляшчота», што будзе выдадзены ў наступным годзе.

● НАВАГОДНЯЕ ІНТЭРВ'Ю ●

# КЛОПАТЫ, ПЛАНЫ, ПАЖАДАННІ...

**ЧЫМ ТАЎСЦЕЙ робіцца левая палова перакіднога календара, тым больш надакучлівай становіцца думка, што яшчэ адзін год пражыты, што на змену яму спяшаецца новы. Ён для нас своеасаблівы панядзелак. Як год мінулы і пазамінулы, будучы і ўсе астатнія. Не ў тым сэнсе, што цяжкі. А ў тым, што ўсякі раз напярэдадні каляндарных змен мы даём сабе цвёрдае слова з 1 студзеня 19... пачаць усё па-новаму. Як? Кожны па-свойму, зыходзячы з уласных патрэб, грамадскіх нагрузак, удзелу ў спартыўна-масавай рабоце, матэрыяльнага і сямейнага становішча. І таму безапеляцыйна вырашаем для сябе... Што іменна? Аб гэтым наша пераднавагодняе інтэрв'ю ў тры пытанні.**

**1. ШТО ЗРАБІЛІ ВЫ, КАБ СТАРЫЯ КЛОПАТЫ ЗАСТАЛІСЯ Ў СТАРЫМ, 1983 ГОДЗЕ?**

**2. У НОВЫ ГОД—З НОВЫМІ ПЛАНАМІ. ЯКІМІ?**

**3. НЕ ЖАДАЙ ДРУГІМ ТАГО, ЧАГО НЕ ЖАДАЕШ САБЕ. ЧАГО ВЫ НЕ ЖАДАЕЦЕ САБЕ?**

### Косця і Зоя РУСАКОВЫ,

**сям'я студэнтаў 5 курса фізічнага факультэта:**

1. Канчаткова вырашылі пытанне: хто ў чыім пакоі жыве.

2. Паспяхова закончыць універсітэт і пайсці працаваць.

3. Мець адно дзіця.

### Аляксандр і Наталля ЦЫБУЛЬСКІЯ,

**сям'я студэнтаў гістарычнага факультэта:**

1. Пажаніліся.

2. Пераженіць усіх сваіх сяброў.

3. Развэду.

### В. ГУРЫС,

**студэнтка II курса механіка-матэматычнага факультэта:**

1. Паставіла кропку на ўсіх клопатах адыходзячага 1983 года. Імкнуся не набываць новых, каб яны не трапілі ў новы год.

2. Згодна з японскім календаром, сімвалам наступнага года з'яўляецца мыш. І хоць ён яшчэ не прыйшоў, але вось першы клопат — шукаю ката. Гэта на ўсякі выпадак...

3. І свайму ворагу не пажадаю перапісваць пасля ў свой час незаканспектаваныя лекцыі. Студэнты! Пішыце лекцыі на лекцыях. Гэта акупляецца.

### А. СЛУКА,

**загадчык падрыхтоўчага аддзялення:**

1. Імкнуўся ператварыць шматлікія клопаты ў дынамічны творчы працэс. Днём чытаў лекцыі студэнтам журфака, арганізоўваў работу падрыхтоўчага аддзялення, выконваў грамадскія абавязкі ў парткоме і прафкоме супрацоўнікаў; вечарамі напісаў каля дзесяці артыкулаў, падрыхтаваў да выдання кнігу і яшчэ спрабаваў выхоўваць сваіх сыноў.

2. Галоўнае—працаваць добрасумленна, тады клопаты будуць адбівацца на тварах не маршчынамі, а радасцю.

3. Не жадаю заспакоенасці, няўважлівых адносін да людзей, ухілення ад грамадскай работы. Жадаю не забывацца на словы Вальтэра, што толькі праца пазбаўляе ад трох бед: суму, заганы і нястачы.

### І. КАРАБАН,

**студэнтка III курса факультэта прыкладной матэматыкі:**

1. Клопаты бываюць розныя. Прыемныя клопаты няхай заўсёды будуць (і ў новым годзе), а непрыемныя... Я іх ліквідую адразу, як толькі яны паяўляюцца.

2. Пачаць новае жыццё (у сэнсе пастаянна рыхтавацца да практычных і семінарскіх заняткаў, не адкладваць да сесіі).

3. Не жадаю двоек у сесію, нуды на святы, не жадаю хварэць у час працы ў СБА. Жадаю ўсяго толькі прыемнага, добрага, раданага.

### С. ГОШКА,

**студэнт V курса гістарычнага факультэта:**

1. Як ні дзіўна, але 1983 год прайшоў для мяне без асаблівых клопатаў. Відаць, навучыўся «быць студэнтам».

2. Планаў шмат. І ўсе розныя. Але асноўны план будзе вясной, пасля размеркавання.

3. Нікому не жадаю сумаваць. Праз паўгода я закончу універсітэт, паеду самастойна працаваць. Крыху сумна развітвацца з сябрамі, з якімі паспеў падружыцца. І ўсё ж сумаваць няма падставы, асабліва перад святам. Поспехаў усім!

### А. ДАНІЛЬЧАНКА,

**студэнтка II курса факультэта журналістыкі, чэмпіёнка універсітэта па лыжных гонках:**

1. Што за жыццё без клопатаў. Не жыццё, а існаванне. Паспрабуйце кожны дзень наведваць заняткі, трэніравацца, сядзець за кнігамі. А калі яшчэ на носе спаборніцтвы? Цяжка, вельмі цяжка. Але ж і прыемна, калі ўсё пераадольваеш, перамагаеш. А каб менш было клопатаў у новым годзе, пастаралася здаць усе залікі своечасова.

2. Паляпшаць свае вынікі, хоць з кожным годам гэта становіцца ўсё цяжэй рабіць.

3. Чаго не жадаю сабе?.. Па некалькі разоў хадзіць на спатканне... да выкладчыкаў для здачы экзамена.

### Ю. ВАРАТНІЦКІ,

**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола:**

1. У 1983 годзе адбыліся важныя для мяне падзеі: камуністы факультэта прынялі мяне кандыдатам у члены КПСС, я паспяхова закончыў факультэт і пачаў працаваць на кафедры радыёфізікі, упершыню быў выбраны членам бюро камітэта камсамола. З гэтымі падзеямі ў мяне звязаны шматлікія, але прыемныя клопаты, і мне зусім не хочацца пакідаць іх у старым годзе. Спадзяюся, што гэтыя клопаты знойдуць свой працяг і ў новым годзе.

А для таго, каб менш засталося паўсядзённых нязначных клопатаў, я імкнуўся прытрымлівацца правіла: «Ніколі не адкладвай на заўтра тое, што можна было зрабіць яшчэ ўчора».

2. У маіх планах: ва ўсіх сферах дзейнасці — у навуковай, грамадскай рабоце — не спыняцца на дасягнутым і рухацца толькі наперад.

3. Сабе і іншым не жадаю дрэннага настрою, не жадаю быць сумнымі і хмурымі. Ніколі і ні пры якіх абставінах не здраджваць жыццёваму аптымізму. У гэтым — залог паспяховага ажыццяўлення самых смелых задумак, аснова моцнага здароўя, неабходная ўмова чалавечага шчасця, таго, за якое нязменна мы паднімаем бакалы ў навагоднюю ноч.

### М. ЛАПША,

**мастацкі кіраўнік і балетмайстар народнага ансамбля танца «Крыжачок»:**

1. Клопаты, клопаты, клопаты... Яны былі ў старым годзе, яны будуць і ў годзе новым. Вось, напрыклад, у нас у ансамблі некаторыя ўдзельнікі заканчваюць універсітэт, а гэта значыць — развітваюцца і з ансамблем. Кожны год прыходзяць навічкі. Дзяўчат шмат, а вось хлопцаў не стае. Вельмі хацелася б, каб у новым годзе наш калектыў папоўніўся хаця б дваццаццю юнакамі. Тады і застаўся б мой самы галоўны клопат у старым годзе.

2. Вядома, новы год прынясе з сабой і новыя планы, новыя задумкі. Збіраемся ў паездку па ГДР, рыхтуем новую праграму да 40-годдзя вызвалення Беларусі. Будуць творчыя канцэрты ў гарадах і вёсках Беларусі, выступленні ў падшэфных воінскіх падраздзяленнях...

3. Не жадаю сабе, а тым больш нікому іншаму розных непрыемнасцей, засмучэнняў, незаслужаных крыўд. Хай заўсёды і ва ўсім будзе добры настрой.

**Ад рэдакцыі.** Мікалаю Вікенцьевічу напярэдадні Новага года споўнілася 60 гадоў. Жадаем яму плённых поспехаў у рабоце, здароўя і таго, чаго жадае ён іншым (глядзіце адказ на трэцяе пытанне).

● МАРЫ, МАРЫ... ●



«КАЛІСЬЦІ І Я БЫЛА ПЕРШАКУРСНІЦАЙ...» ЧАЦВЁРТАКУРСНІЦА ГЕАГРАФІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ВОЛЬГА ЗАХАРАВА НА ВЕЧАРЫ ПАСВЯЧЭННЯ ПЕРШАКУРСНІКАЎ У СТУДЭНТЫ.

Фотаэцюд С. Плыткевіча.

# НАВАГОДНІ КАЛЕЙДАСКОП

### АСТАТНЯЕ — ДРОБЯЗІ

⊙ АДЗІН з парыжскіх дамоў мадэлей аб'явіў конкурс сярод мужчын. Пераможцам па яго ўмовах стане той, хто найбольш трапна адкажа на пытанне: «Як, па-вашаму меркаванню, павінна апранацца дзяўчына на афіцыйны вечар?» Першы прыз быў атрыманы за адказ—«Хутка».

### САЛАМОНАВА РАШЭННЕ

**⊙ АДНАМУ з супрацоўнікаў Калумбійскага універсітэта доктар параіў строгую дыэту, каб пахудзець. Пацыент звярнуўся ў мясцовы вылічальны цэнтр з пытаннем: «Што рабіць, каб з'ядаць максімальную колькасць ежы і прытым захоўваць нізкакаларыйную дыэту?» Камп'ютэр доўга працаваў і ўрэшце паведаміў рэзультат: «Вы можаце штодзень выпіваць 300 літраў воцату».**

### СВОЕЧАСОВАЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ

⊙ ЯК ПАВЕДАМІЎ штотыднёвік «Нойе берлінэр ілюстрыртэ» (ГДР), адна парыжская фірма пачала выпускаць арыгінальныя вагі. Калі вага іх уладальніка дасягае ста кілаграмаў, уключаецца ўманціраваны ў прыстасаванне мініяцюрны магнітафон і гучыць «Траурны марш» Шапэна.

### МАРАФОНСКІ... ПАЦАЛУНАК

**⊙ АМЕРЫКАНСКІЯ студэнты Патрысія Хоэн і Брэд Спэйсі, якія ўстанавілі новы сусветны рэкорд па працягласці пацалунка (407 гадзін), задаволены ўдвая. Па-першае, іх імёны занесены ў «Кнігу рэкордаў Гінеса». Па-другое, як запэўніваюць рэкардсмены, іх марафонскі пацалунак папярэдзіў разрыў паміж імі: яны зразумелі, што ім нельга разлучацца.**

### РЭКОРДЫ, РЭКОРДЫ...

⊙ ПАСТАЎЛЕНЫ новы сусветны рэкорд па запамінанню. Ён належыць 23-гадоваму індыйцу С. Махедзевану, студэнту-псіхолагу з горада Мангалуру. За 3 гадзіны 59 мінут ён запомніў і паўтарыў напамяць 31.811 лікаў. Папярэдні рэкорд — 28.013 лікаў за 9 гадзін 14 мінут.

### САМ СЯБЕ ПАКАРАЎ

**⊙ СТАРШЫНЯ суда амерыканскага горада Санта-Фе (штат Нью-Мексіка) спазніўся на судовае пасяджэнне на пяць мінут. Суддзя вырашыў прадэманстраваць прынцыповасць і прыгаварыў сябе да штрафу ў 50 долараў.**

● Фотатрагікамедыя ў 4-х дзеях «Урокі этыкі на занятках па логіцы» ●



*Лірычна-Іранічны ФакультэТ віншуе сваіх шчырых сяброў з Новым годам, зычыць лірычнага настрою і дасціпных жартаў*

# СТУДЭНЦКІ ГАРАСКОП

**«ЗОРКІ ГАРАЦЬ, каб свяціць усім». Толькі не ўсе гэта разумеюць. І таму дзяжурны па ліфтавой, заручыўшыся дапамогай Леаніда Трэера, а таксама вынікамі работы ЭВМ у гэтым кірунку, астранамічнымі назіраннямі, лічыць справай гонару давесці да ўсіх сяброў «ЛІФТа», што каму свеціць. А каму не свеціць. Калі вы яшчэ не запамяталі дату свайго нараджэння, лічыце гэта ўмовай ведаць пра сябе ўсю праўду. Нават горкую.**

**«Студэнцкі гараскоп» мае вялікую практычную карысць. Камсамольскія актывісты змогуць выкарыстоўваць яго для выдачы характарыстык. Выкладчыкі — зведаць усю праўду пра сваіх выхаванцаў. І наадварот. Для дэканата «СГ» павінен стаць першым дапаможнікам у справе налічэння і пазбаўлення стыпендый.**

**Заўвага. Людзям, у якіх няма пачуцця гумару, але ёсць пачуццё, што няма гэтага пачуцця, а таксама тым, у каго няма ні таго, ні другога, чытаць гараскоп катэгарычна забараняецца.**

### КАЗЯРОГ
**(22 снежня — 20 студзеня)**

Фізічна развіты, маральна ўстойлівы. Справу па душы выбірае сабе яшчэ ў гады маленства. Таксама, як і факультэт. Таму змяніць сваё рашэнне калі і жадае — не можа. На заліках і экзаменах не рызыкуе, але гэта не гарантуе поспеху. Найвышэйшая працаздольнасць прыходзіць у час сесіі, пасля чаго нават за канікулы не паспявае прыйсці у сябе. Шлюбы ў час студэнцтва катэгарычна выключаюцца.

Прагноз на новы год. Год для вас спрыяльны. Будзеце атрымліваць стыпендыю. Дэканат будзе вамі задаволены, што аднак не застрахоўвае ад крытыкі на камсамольскіх і прафсаюзных сходах. Не выключана вялікае каханне ў час летняй сесіі. Трэба сябе перамагчы: пачуцці не працуюць на стыпендыю.

### ВАДАЛЕЙ
**(21 студзеня — 18 лютага)**

Месяцамі можа хадзіць на практычныя заняткі непадрыхтаваным, не весці канспекты лекцый. Пры гэтым перажывае, што прыходзіцца атрымліваць незаслужаную стыпендыю. Калі ж перыяд пасіўнасці змяняецца актыўнасцю — апантана хапаецца за любую справу. Падчас яму здаецца, што вось-вось яго пазбавяць стыпендыі альбо аб'явяць вымову. Іменна ў гэты момант яму даручаюць адказную справу. Вадалей ніколі нічога не просіць, аднак усё мае. Можа знайсці нечаканы выхад і, зусім не рыхтуючыся, здаць сесію. Аднак мае патрэбу у кампаньёнах.

Прагноз на новы год. Год будзе напружаны і цікавы. У час першага семестра могуць аб'явіць вымову, зняць стыпендыю і г. д. Аднак гэта не пашкодзіць здаць сесію на выдатна. Нехта будзе вам капаць яму. Аднак трапіць у яе сам. Не захапляйцеся афёрамі. Часцей бывайце на свежым паветры.

### РЫБА
**(19 лютага — 22 сакавіка**

Рыба валодае багатым уяўленнем, якое яе часта падводзіць. Кар'ера не захапляе, але для расшырэння кругагляду яна нярэдка займаецца грамадскай работай. Рыбе ўласціва плысці за вадою. Таму вельмі важна трапіць у струмень плыні. Падчас рыбы вучацца таму, да чаго не маюць аніякіх здольнасцей. Нягледзячы на нерашучасць, схільны на непрадказаныя ўчынкі з непрадказанымі вынікамі ў залікоўцы.

Прагноз на новы год. Вас чакае якійсьці поспех. На летніх канікулах адпачывайце. У канцы года магчымы фінансавыя цяжкасці. Будзьце пільнымі, могуць пазбавіць стыпендыі. Што б ні здарылася — трымайцеся з гонарам. Калі сказалі «а», кажыце і «б».

### ОВЕН
**(23 сакавіка — 20 красавіка)**

Энергічны, працаздольны, добры спартсмен. Спачатку нешта робіць, пасля думае. Падуладны перыядам бязмежнага аптымізму (калі прымае сацыялістычныя абавязацельствы, складае асабісты комплексны план) аж да непрабуднага песімізму (калі атрымлівае вымову).

Прагноз на новы год. Дасягнеце вялікага поспеху, калі не дапусціце непапраўнай памылкі. Патрабуецца асцярожнасць. Асабліва ў час сесіі. Таму не спадзявайцеся на сяброў. Будзеце атрымліваць стыпендыю, але ўсё роўна не будзе яе хапаць. У красавіку не прымайце удзелу у пікніках на прыродзе.

### ЦЯЛЕЦ
**(21 красавіка — 21 мая)**

Натура складаная і супярэчлівая. Першым прапаноўвае новыя ідэі і першым жа іх забывае. Валодае здаровымі інстынктамі. Знаходзіць радасць ва ўсім. Нават у няўдачах. Дзякуючы шырокім сувязям яго не пазбаўляюць стыпендыі, не выключаюць, а паспяхова пераводзяць на наступны курс. Вельмі здольны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці. Можа выступаць на спартыўных спаборніцтвах. Для масавасці. Збор членскіх узносаў лепш не даручаць.

Прагноз на новы год. Працы будзе шмат. Грамадскай таксама. Непрыемнасцей, звязаных з ёю, не чакаецца. Ад сесіі да сесіі пражывяце весела, але на працягу наступнага семестра прыйдзецца здаваць хвасты. Увесь час за вамі будзе сачыць адна зацікаўленая асоба. Таму дыскатэкі лепш не наведваць.

### БЛІЗНЯТЫ
**(22 мая — 21 чэрвеня)**

Матэрыял, нават складаны і заблытаны, успрымаюць амаль з ходу, не паспяваючы нават даведацца пра думку выкладчыка на гэты конт. Таму на экзаменах блізняты часта трапляюць, мякка кажучы, у няёмкае становішча. Інтуіцыя выручае ў складаных выпадках, але падводзіць у простых. Увесь час імкнуцца даведацца, што пра іх думаюць. Даведаўшыся — не вераць. Блізняты даюць найбольшую колькасць геніяў і няўдачнікаў. Прычым першыя лічаць сябе няўдачнікамі, другія — геніямі.

Прагноз на новы год. У новым навучальным годзе патрабуецца актыўнасць. Але не мітусіцеся. Вам прапануюць паехаць у будатрад. Там будзе нецікава. Але не выключана магчымасць добра зарабіць. Застанецеся пры сваіх інтарэсах.

Сцеражыцеся ангіны. Калі курыце—на ўсякі выпадак кіньце.

### РАК
**(22 чэрвеня — 21 ліпеня)**

Народжаныя пад гэтым знакам прадчуваюць непрыемнасці за два гады да іх узнікнення. Але здараюцца яны раней. Да пачатку сесіі. І не там, дзе іх чакаеш. З дзвюх бед выбірае меншую, якая ў выніку атрымліваецца большай. Таму на экзаменах не заўсёды атрымлівае добрыя адзнакі, хаця лекцыі на працягу семестра наведвае старанна. Рак таленавіты. Невядома, у чым. З ганарараў і іншых дадатковых фінансавых крыніц членскіх узносаў не плоціць.

Прагноз на новы год. Будзе садзейнічаць поспех. Калі не страціце сумленне. Пасля летняй сесіі вас некуды пашлюць... Магчыма, што ў будатрад.

### ЛЕЎ
**(22 ліпеня — 21 жніўня)**

Леў, як правіла, моцны. Добры кіраўнік. Але задарма нічога не робіць. Залішняя самаўпэўненасць штурхае льва на няўдалыя авантуры з далейшым ператварэннем яго ў казла адпушчэння. Перад ільвом адкрыта шмат дзвярэй, але не заўсёды ён знаходзіць патрэбную. Любіць усё чалавецтва, не засяроджваючыся на прыватнасцях. Гонар не дазваляе яму карыстацца падказкамі на экзаменах.

Прагноз на новы год. Устрымайцеся ад рэканструкцый, рэарганізацый і іншых буйных авантур. Не мяняйце захапленні, стыль вучобы, метады здачы сесіі. Патрывайце.

### ДЗЕВА
**(22 жніўня — 21 верасня)**

Народжаныя пад гэтым знакам валодаюць ясным розумам. Таму сесію здаюць без асаблівых цяжкасцей. Пры дапамозе логікі яны здольны загнаць у кут любога выкладчыка. І сябе таксама. З іх атрымліваюцца тэатральныя крытыкі і судовыя эксперты (да ведама студэнтаў журфака і юрфака). Што ні робяць, робяць добра, за выключэннем 30 і 31 кожнага месяца. Хлусіць не любяць. Таму на камсамольскіх сходах выступаюць з дзелавой, прынцыповай крытыкай. Крытычны розум Дзеў прыносіць клопат дэканату і прафесарскаму саставу, з-за чаго ўзнікаюць цяжкасці на экзаменах. Не карыстаюцца спагадай у выкладчыкаў, хаця, па-праўдзе кажучы, не было выпадку, каб яе да іх праяўлялі.

Прагноз на новы год. Сумаваць не прыйдзецца. Калі не атрымлівалі стыпендыю — атрымаеце, але гэта прынясе дадатковыя клопаты. Патрэб стане больш, магчымасцей іх задаволіць—менш. Прадбачацца прыемныя клопаты з разумным чалавекам. Раніцай карысна рабіць зарадку.

### ВАГІ
**(22 верасня — 21 кастрычніка)**

Адрозніваюцца прыемным выразам твару. Што, аднак, не страхуе ад непрыемнасцей. Настолькі занепакоены сваім спакоем, што могуць гадамі праяўляць нерашучасць. Праўда, называюць такі стан прадбачлівасцю. Пункт гледжання залежыць вельмі часта ад субяседніка, асабліва калі ён — экзаменатар. Багатае ўражанне дазваляе Вагам прымаць жадаемае за наяўнае, што радуе дэканат. Жыццёвы шлях высланы добрымі намерамі. Чаго не скажах аб справах.

Прагноз на новы год. Вы пражывяце яго без страт. Будзе невялікі спад у час летняй сесіі, але адмоўных вынікаў не чакаецца. Сцеражыцеся бландзіна з прыгожым почыркам. Білет на экзаменах бярыце правай рукой.

### СКАРПІЁН
**(22 кастрычніка — 21 лістапада)**

Народжаныя пад гэтым знакам — суцэльная супярэчлівасць. Сквапныя да ведаў, але вучыцца перастаюць у 24 гады і пачынаюць вучыць другіх. Для іх адкрыты дзверы аспірантуры. Падчас скарпіёна падводзіць дзіцячая даверлівасць, але выратоўвае хваравітая падазронасць. Абапіраецца на веды, атрыманыя ў семестры, але верыць у сны. Сяброў і ворагаў набывае яшчэ ў час здачы ўступных экзаменаў. Але дзеля карысці справы гатоў памяняць іх месцамі. Што часта і бывае. Сябры па групе ахвотна дзеляцца з ім сваімі думкамі, аб чым пасля шкадуюць. Зорак з неба не хапае, але свайго не ўпусціць.

Прагноз на новы год. Фартуна будзе да вас пачціва вясной і абыякава восенню. Дадуць грамадскае даручэнне — не адмаўляйцеся. Не пазычайце грамадскія грошы, аддаваць прыйдзецца ж свае. Паедзеце ў будатрад — не піце!

### СТРАЛЕЦ
**(22 лістапада — 21 снежня)**

Заўсёды ведае, чаго жадае. Але часта сумуе, таму што жадае вельмі многа. Валодае талентам захапляць думкай сяброў, таму яго памылкі абыходзяцца вельмі дорага. Настолькі імкнецца ў будучыню, што забывае надзённае. Гэтым тлумачацца складанасці ў час сесіі. Стралец не носіць камень за пазухай — трымае ў руцэ.

Прагноз на новы год. Чакаюцца змены ў вашым студэнцкім жыцці. У які бок — невядома. У сакавіку будуць дакараць за актыўнасць, у кастрычніку — за пасіўнасць. У час летняй сесіі ад вас патрабуецца пільнасць. Звярніце ўвагу на сваё харчаванне. Лепш сесці на дыету.

## ● НАВАГОДНІЯ ЎСМЕШКІ МАСТАКА ●




БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

29 снежня 1983 г.

Зак. 2232 04650

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ